Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

22 САКАВІКА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 54 (28921)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ГІСТОРЫІ З ЖЫЦЦЯ НАШЫХ ЧЫТАЧОЎ 5

ЯК ЗАРАБІЦЬ АГРАРЫЮ? МС

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый МУРЫН, начальнік галоўнага ўпраўлення манетарнай палітыкі і эканамічнага аналізу Нацыянальнага банка:

«Тэндэнцыя, трэнд на паступовае зніжэнне працэнтных ставак будзе захоўвацца. Але шмат што залежыць ад таго, як складзецца ўзровень інфляцыі ў краіне, што будзе з інфляцыйнымі чаканнямі (па нашых ацэнках, яны цяпер у два разы перавышаюць фактычны ўзровень інфляцыі). Нацбанк будзе працаваць над тым, каб інфляцыя захоўвалася ў найбліжэйшыя пяць гадоў на ўзроўні не больш за 4-5 %. Асноўныя намаганні будуць накіраваны на кантроль над грашовым прапанаваннем, гэта ключавы фактар, які забяспечваў бы цэнавую стабільнасць».

Нашчадкі зямлі старажытнай

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Падлеткі з аграгарадка Друя Браслаўскага раёна.

КОРАТКА

- Жыхары Беларусі ў 2019 годзе будуць кампенсаваць каля 80,5 % выдаткаў на аказанне паслуг ЖКГ (з улікам павышэння тарыфаў з 1 студзеня).
- **Акцыя «Дзень памяці» пройдзе 22 сакавіка ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**
- На правядзенне веснавых палявых работ у Беларусі ў 2019 годзе неабходна Br1 млрд 821,4 млн.
- **Франтавы бамбардзіроўшчык Су-24 усталююць у Гомелі.**
- У сувязі з пачаткам школьных канікул ДАІ заклікае кіроўцаў абавязкова зніжаць хуткасць у дварах.

ПАСЛЯЗАЎТРА ЎЖО БЛІЗКА

На заводзе «Штадлер Мінск» вырабілі новую версію цягніка для мінскага метро

Фота Андрэя САЗОНАВА.

СТАР. 2

Узровень

Андрэй КАРОЛЬ:

«Студэнтаў трэба задзейнічаць у кухні па «прыгатаванні» ведаў»

Рэктар БДУ пра нешаблоннае мысленне, эўрыстычнае навучанне і адмаўленне ад маналогу

Амаль паўгода таму на Савеце БДУ былі агучаны стратэгічныя мэты развіцця ўніверсітэта: сярод іх фігуравалі павышэнне якасці адукацыі, выбудоўванне кадравай палітыкі з апорай на рэальныя дасягненні супрацоўнікаў, павелічэнне колькасці прафесарска-выкладчыцкага складу з вучонымі ступенямі і нават уваходжанне ў 1 % найлепшых універсітэтаў свету. Як вядзецца работа па рэалізацыі пастаўленых задач? Каго павінен рыхтаваць універсітэт: вузкіх прафесіяналаў ці асоб з фундаментальнай падрыхтоўкай і шырокім кругаглядам? Без якіх навыкаў нельга абысціся ў сучасным свеце? Аб усім гэтым мы гутарым з рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктарам педагагічных навук, прафесарам Андрэем КАРАЛЁМ.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» — і выйграй карысны прыз!

Працягваецца падпіска на II квартал 2019 года

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – БУДЗЕ ЦІКАВА!